амерыканская палітычная ідэалогія з’яўлялася сінтэзам ідэй як англійскага асветніцтва, так і новаанглійскага пратэстантызму.

**Літаратура**


1. *Benson P. L., Willliams D. L.* Religion on Capitol Hill: Myths and Realities. New York, Oxford: Oxford university press, 1986.
2. *May H. F.* The Enlightenment in America. New York: Oxford university press, 1976.
3. *Бурстин Д.* Американцы: колониальный опыт / Под общей ред. и с коммент. В. Олейника. М.: Прогресс. Литера, 1993.
4. *Паррингтон В. Л.* Основные течения американской мысли. Т. 1. Система взглядов колониального периода. М.: Изд. иностр. лит., 1962.
5. *Leder L. H.* Liberty and Authority. Early American political ideology 1689–1763. Chicago: Quadrangle Books, 1968.
6. Інтэрнэт-адрас: http://www.founding.com/ library/ lbody.cfm?id=230&parent=52
7. *Кислова А.* Идейные истоки революции // Война за независимость и образование США/ Под ред. Г. Н. Севостьянова. М.: Наука, 1976.


## ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ ПОЛАЦКАЙ ДЫНАСТЫІ РАГВАЛОДАВІЧАЎ У К.10–П.11 стст.


**Д. І. Кузьма**


У апошняй чвэрці 10 ст. полацкі пасад займаў князь Рагвалод. Наяўнасць дарослых (прынамсі – Рагнеды) дзяцей сведчыць аб тым, што Рагвалод быў ужо сталага веку, а, значыць – мог ужо працяглы час кіраваць Полаччынай, і нават можна меркаваць, што ўжо ў той час ён заняў гэтую пасаду як законны спаднаемца, бо на карысць гэтай высновы будзе сведчыць як вяртанне яго ўнука Ўсяслава на Палаччыну нармальна ўспрынятае мясцовым насельніцтвам, а пасля – княжэнне яго сыноў у Полацку, так і трывалае становішча адрадзіўшайся дынастыі Рагвалодавічаў сярод мясцовага насельніцтва, у свядомасці якога панавала думка, што толькі нашчадкі Ронвалода маюць законныя правы на полацкі пасад. Дакладна невядома з каго пачалася полацкая дынастыя, але яна безумоўна, мае досыць высокі варажскі пачатак [1, с. 13]. Так, Уладзімір, зняславіўшы полацкую князеўну Рагнеду, узяў яе ў жонкі, што, нягледзячы на вялізарны гарэм Уладзіміра (каля 800 наложніц), сведчыла аб яе высокім статусе, а значыць- і статусе яе дзяцей. Акрамя Рагнеды ў Уладзіміра было яшчэ чатыры жонкі, якія таксама былі высокага сацыяльнага паходжання. Да таго ж пабранне з Рагнедаю (досыць высокамернаю, калі верыць сведчанням летапісу, што было характэрна для арыстакратычных асобаў) аўтаматычна ўздымала і статус Уладзіміра найперш у вачах варажскага акружэння, які, з’яўляючыся «рабынічам» – сынам рабыні-князеўны Малушы, меў патрэбу ў

самасцвярджэнні. Варажскія князі вельмі паволі асіміляваліся ў славянскім асяроддзі, і таму пытанне чысціні крыві мела вялікае значэнне. Каб пазбавіцца ўплыву моцнай і кансерватыўнай варажскай дружыны Ўладзімір адсылае яе ў Візантыю [2, с. 38] з таемным наказам імператару ніколі не вяртаць яе назад, а сам пачынае абапірацца на дружыну набраную з прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва. Такая палітыка паклала пачатак размыванню ўстойлівасці вялікакняжацка-варажскага роду. Працэс пераўтварэнняў у вышэйшых колах улады можна прасачыць, правёўшы аналіз атрыманых дзецмі Уладзіміра імёнаў, бо большасць з іх не ўпісваецца ў дамінаваўшую раней варажскую традыцыю. Так, з дванадцаці законных сыноў кіеўскага князя (улічваючы прыёмнага Святаполка) сем маюць корань-прэфікс «–слав» указваючы ўжо на славянскія асаблівасці імёнанадавання, роднасныя азіяцкім –бен, -сан і інш [3, с. 92].

У той жа час вельмі цікавая сітуацыя складалася з Рагнедай. Па-першае, скандынаўскі аналаг «Rognhield» можа ўказваць не толькі на імя, але і на прыналежнасць, прынамсі, як «дачка Rogn-[wald]-a», што яшчэ патрабуе спецыяльнага вывучэння мовазнаўцамі-лінгвістамі, а, па другое, паміж Rogn-wald і Rogn-hield існуе яскравая цесная сувязь, што пасля магло быць выкарыстана кіеўскімі князямі пры падкрэсліванні прынадлежнасці да кіруючага роду.

Так, палачанку Рагнеду прымусілі прыняць новае славянскае імя «Гарыслава», што павінна было сведчыць як аб знішчэнні магутнасці яе родзічаў, так і аб перараджэнні князеўны, пачатку ёю новага жыцця. Аналізуючы этналагічны сэнс гэтага імя, можна сцвярджаць, што яно мела мэтаю прынізіць ганарлівасць князеўны, паказаць сканчэнне ,»згасанне» слаўнага роду полацкіх князёў, а ў той жа час, згодна старажытнай салярнай сімволікі, агню надавалася ачышчальнае значэнне і таму «згарэўшая слава» ўсё ж такі магла адрадзіцца ў дзецях Рагнеды-Гарыславы. На жаль, невядома на аснове чаго адбывалася наданне дзецям імёнаў у княжацкай сям’і і якое значэнне тут мела як пазіцыя бацькі, так і пазіцыя маці. Аб ролі маці могуць сведчыць імёны сыноў Уладзіміра – «Позвізд» (характэрны чэшскі ўплыў) ці «Барыс и Глеб» (хутчэй за ўсё – балгарскі ўплыў, пазней вельмі папулярныя сярод усходніх славян).

Ад Уладзіміра Рагнеда мела чацвёра сыноў – Узяслава, Яраслава, Мсціслава, Усевалада і дзвюх дачок – Прадславу і Прэміславу. Наяўнасць у пяцёх з іх у імя асновы -слав сведчыць як аб кроўнай сувязі іх з Гары-славай, так і аб прыналежнасці да «слаўнага» вялікакняжацкага роду. Што ж датычацца імя Усевалада, то тут магчыма правесці паралелі

з Рагвалодам і цалкам верагодна, яго ўжо з самага нараджэння рыхтавалі для кіравання полацкімі прывічамі як прадаўжальніка мясцовай дынастыі, а значыцца і яе традыцый імянадання, так і прадстаўніка кіеўскага двара на гэтых землях. Але, як вядома па летапісных крыніцах [4, с. 65], лёс склаўся зусім па-іншаму і ў землі крывічоў быў адпраўлены другі сын Рагнеды – Ізяслаў, асоба вельмі цікавая, супярэчлівая і таямнічая. Згодна, паданню, ён, будучы яшчэ хлапчуком, з мячом у руках заступіўся за сваю маці, якая павінна была ў такім родзе мець на яго асабліва моцны ўплыў і магла пазнаёміць яго з лёсам дзеда Рагвалода і яго братоў, што натуральна магло ўзняць ў Ізяславе нянавісць да жорсткага і бязлітаснага бацькі. З іншага боку, і Рагнеда, зрабіўшы няўдалы замах на жыццё Ўладзіміра, слабая жанчына, ні на што добрае не магла разлічваць і ужо яе жыццё было пад пагрозай.

Пасля парады з баярамі кіеўскі князь адсылае Рагнеду з сынам Узяславам у землІ полацкіх крывічоў, дзе для іх засноўваецца горад Ізяславль – з аднаго боку як альтэрнацыйны старадаўняму і вялічнаму Полацку цэнтр, а з другога – як больш блізкі да Кіева цэнтр вялікакняжацкага ўплыву. Чаму ж Рагнеда-Гарыслава была адпраўлена менавіта на гэтыя землі, дзе ўсе дарагое і блізкае яе сэрцу было панішчана? Справа можа быць у тым, што, згодна старадаўняму варажскаму звычаю, але толькі ў тым выпадку калі Ўладзімір яго прытрымліваўся, існавала традыцыя так званага «папярэдняга дару» перад шлюбам [1, с. 18], і, канешне, такім падараваннем магла стаць частка крывіцкіх зямель.

Рагнеда і Ізяслаў не аказвалі супраціўлення палітыцы магутнага Ўладзіміра, што праявілася ў іх актыўным удзеле ў працэсе хрыстыянізацыі Русі. Так, Рагнеда стала першай усходнеславянскай жанчынай-манахіняй, прыняўшы імя Анастасія і, магчыма, заснаваўшы свой манастыр пад Заслаўем [5, с. 42], верагодна нават здзейсніўшы падарожжа ў Канстанцінопаль.

**Літаратура**

1. *Катлярчук А.* Шведы ў гісторыі Беларусі. Мн. 2003.
2. *Татищев В.* История Российская в 7 томах. М. 1963.
3. Рюрикови:словарь-справочник. М. 1998.
4. Повесть временных лет. М. 1969.
5. *Штыхов Г. В.* Города Полоцкой земли. Мн. 1978.